**УДК 94(476):331.108**

# КАДРЫ І ЯКАСЦЬ ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ НА САВЕЦКІМ ЭТАПЕ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ

**Пушкін І. А.**
**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій**
**г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 студзеня 2025 г. падпісаў Указ № 31, якім 2025–2029 гг. аб’яўлены пяцігодкай якасці. Прыярытэтныя мэты пяцігодкі – далейшае павышэнне якасці жыцця людзей, канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, удасканаленне грамадскіх адносін. Гэтага немагчыма дасягнуць без аналізу і ўсебаковага вывучэння шляхоў развіцця Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды яе дзяржаўнасці. У прыватнасці, у другой палове XX ст., калі Савецкая Беларусь пачала займаць вядучыя пазіцыі ў эканоміцы СССР.

За ўвесь час пабудовы сацыялізму партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР і БССР не здолела вырашыць праблемы якасці харчовых тавараў. Аб чым сведчаць дакументы тых часоў. У чацвёртым квартале 1969 г. была праведзена праверка якасці выпускаемай прадукцыі на 44 прадпрыемствах Магілёўскай вобласці. На Бабруйскім малочным заводзе было забракавана 23,8 % усёй цэльнамалочнай прадукцыі (малако, тварог, марозіва), на Асіповіцкім кансервава-харчовым камбінаце 7,9 % кандытарскіх вырабаў (пернікі) і 21,3 % кансерваванай гародніны, на Клічаўскім харчовым камбінаце 100 % ад наяўных кансерваў садавіны і гародніны, на Быхаўскім хлебазаводзе 6,1 % усіх хлебабулачных вырабаў – 2 454 кг (хлеб, батоны, абаранкі), 6,1 % хлебабулачных вырабаў на Крычаўскім заводзе, 6,3 % хлебабулачных вырабаў на Мсціслаўскім хлебазаводзе, на Чэрыкаўскім гароднінасушыльным заводзе 14,5 % плодагароднінных кансерваў, на Бабруйскім плодакансервавым камбінаце 40,7 % кансерваў ад агульнай колькасці правераных (салянка), на Глускім хлебазаводзе 14,6 % хлебабулачных вырабаў [1, арк. 3-8]. За 1969–1971 гг. прадпрыемствы абласнога вытворчага аб’яднання малочнай прамысловасці недабраякаснай і нестандартнай прадукцыяй нанеслі страты дзяржаве ў памеры 412,6 тыс. рублёў [2, с. 251].

У 1976 г. Гродзенская абласная лабараторыя дзяржнагляду за стандартамі і вымяральнай тэхнікай праверыла якасць тавараў на 21 прадпрыемстве Гродзенскай вобласці. З іх 14 прадпрыемстваў (66,7 %) парушалі патрабаванні стандартаў і тэхнічных умоў. Не адпавядалі стандартам і мелі нізкую якасць: воцат спіртавы на Гродзенскім вінзаводзе; напоі “Яблык” і “Лімон” Слонімскага вінзавода; віно “Белае моцнае” і “Клубнічнае” Дзятлаўскага вінзавода; падліўка таматная Сольскага агароднінасушыльнага завода. Ад 18 да 48 % прадукцыі Гродзенскага хлебакамбіната і 12 % ад колькасці праверанай прадукцыі Слонімскага хлебакамбіната не адпавядалі патрабаванням стандартаў па нездавальняючаму знешняму выгляду, смакавым паказчыкам, завышанаму ўтрыманню вільгаці. Не адпавядалі стандартам і былі забракаваныя на Слонімскім мясакамбінаце каўбасы вараныя “Закусачная” і “Чайная”, сасіскі “Любіцельскія”; Гродзенскім мясакамбінаце рулет вэнджаназапечаны і каўбаса “Доктарская”; Ваўкавыскім мясакамбінаце каўбаса паўвэнджаная “Адэская”, вараная “Часночная ялавічная” і рагу свіное; Зэльвенскім маслазаводзе філіяле Ваўкавыскага малочна-кансервавага камбіната сыр дыетычны і інш.[3, арк. 144-149]

Безумоўна, такая сітуацыя не задавальняла кіраўніцтва рэспублікі. Рабіліся намаганні па паляпшэнні якасці прадукцыі. Пэўныя поспехі былі. Але выправіць сітуацыю цалкам не атрымоўвалася. На XX Гродзенскай абласной партыйнай канферэнцыі (1985 г.) адзначалася, што асноўная прычына нізкай якасці прадукцыі – "нядбайнасць, халатнасць, нядобрасумленнасць выканаўцаў рознага рангу – ад рабочага да галоўнага спецыяліста і дырэктара" [4, арк. 13].

У 1980-я гг. у БССР працягвалі мець месца шматлікія факты выпечкі хлебабулачнай прадукцыі з надрывамі і расколінамі, дэфармацыяй і падгарэласцю боханаў хлеба, нераўнамернай сітаватасцю. У 1986 г. было забракавана 148 тон вырабаў ці 7,2% ад праверанай колькасці прадукцыі. Найбольш парушэнняў дапускалася на прадпрыемствах Міністэрства хлебапрадуктаў Брэсцкай і Магілёўскай абласцей. У аб'яднанні "Брэстхлебпрам" вытворчы брак павялічыўся ў першым квартале 1987 г. у параўнанні з першым кварталам 1986 г. у 1,5 разы. На прадпрыемствах Магілёўскай вобласці ў студзені – сакавіку 1987 г. забракавалі 25,4% абследаванай прадукцыі. У мясцовыя органы ўлады і сродкі масавай інфармацыі толькі за першы квартал 1987 г. паступіла 13 тыс. лістоў і зваротаў з прэтэнзіямі да якасці хлеба і яго асартыменту [5, с. 188].

На прадпрыемствах Савецкай Беларусі прымаліся меры па барацьбе з нізкай якасцю прадукцыі: асобы вінаватыя ў вырабе і выпуску прадукцыі, якая не адпавядала нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, прыцягваліся да матэрыяльнай і дысцыплінарнай адказнасці, праводзілася атэстацыя работнікаў і працоўных месцаў, звязаных з праверкай якасці прадукцыі. Практыкавалася ўвязка памераў прэміравання з якасцю прадукцыі, яе асартыментам, наяўнасцю прэтэнзій і рэкламацый. Тым не менш, праблемы якасці прадукцыі не здолелі вырашыць канчаткова.

Такім чынам, для апошніх дзесяцігоддзяў савецкага этапу дзяржаўнасці Беларусі былі ўласцівыя шматлікія факты вырабу прадуктаў харчавання нізкай якасці. Спробы выправіць становішча шляхам змяняльнасці кадраў, павышэння эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы не прыносілі чаканага выніку. Фактычны і аналітычны матэрыял аб працы прадпрыемстваў харчовай вытворчасці ва ўмовах савецкай мадэрнізацыі Беларусі дазваляе асвятліць уплыў кадраў харчовай прамысловасці на працэсы фарміравання сучаснай мадэлі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця краіны і дасягненні беларускай эканомікі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Справка о качестве продукции, проинспектированной на промышленных предприятиях Могилевской области (1969) // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. – Ф. 9. Воп. 145. Спр. 99.

2. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с.

3. Справка Гродненской областной лаборатории госнадзора за стандартами и измерительной техникой от 14.09.1976 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці ДАГр. – Ф. 1171. Воп. 5. Спр. 60.

4. Протокол XX Гродненской областной партийной конференции 20–21.12.1985 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1543.

5. Пушкін, І. А. Кадры і якасць хлебапрадуктаў у апошняе дзесяцігоддзе савецкай мадэрнізацыі Беларусі / І. А. Пушкін // Техника и технология пищевых производств: материалы XV Юбилейной Междунар. науч.-техн. конф., 19–20 апреля 2023 г., в 2-х т., Могилев / Учреждение образования «Белорусский государственный университет пищевых и химических технологий»; редкол.: А. В. Акулич (отв. ред.) [и др.]. – Могилев: БГУТ, 2023. – Т. 1 – С. 188–189.